## Ратуемся спадчынай

✓**7 чэрвеня** ў Купалаўскім мемарыяльным запаведніку «Вязынка» пачала працу выстава работ мастака Віктара Данілава **«Мой родны кут»**. Вязынка – знакамітае месца нараджэння Янкі Купалы. У 1945 г. тут быў заснаваны філіял музея Янкі Купалы, які з 1948-га па сённяшні дзень адкрыты для наведвальнікаў. Хата, у якой нарадзіўся паэт, краявіды, сярод якіх рос будучы класік, здаўна вабяць мастакоў і фатографаў. Сёлета на выставе ў рэканструяваным свіране прадстаўляе свае работы жыхар блізкай ад Вязынкі вёскі Пятрышкі мастак Віктар Данілаў. Яго работы, створаныя ў розныя поры года ў жанры архітэктурнага пейзажа, адлюстроўваюць Вязынку і яе ваколіцы, маляўнічыя куткі Заслаўя, Радашковічаў, Маладзечна.

Выстава працуе да кастрычніка.




✓**7 чэрвеня** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася персанальная выстава работ беларускага мастака Георгія Міхейчыка **«Дудзінка»**. На ёй прадстаўлена больш за 40 работ майстра пейзажа, які выкарыстоўвае мноства ўласных аўтарскіх прыёмаў, што дазваляюць зрабіць вобраз больш выразным і яскравым. Наведвальнікі ўбачаць краявіды Барысаўшчыны, у якіх мастак паказвае прыгажосць прыроды роднага краю.

Выстава прадоўжыцца да 20 чэрвеня.

✓ **8 чэрвеня** ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь пачала працаваць выстава работ выпускнікоў Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А.К. Глебава **«Ступені майстэрства»**, прысвечаная 75-годдзю каледжа і 120-годдзю з дня нараджэння А.К. Глебава. За 75 гадоў каледж набыў статус адной з вядучых устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі мастацкага профілю краіны. Мінскае мастацкае вучылішча (так называўся каледж да 2011 г.) стала для многіх знакамітых мастакоў першай прыступкай на іх прафесійным шляху. Менавіта тут першыя ўрокі майстэрства атрымалі народныя мастакі Беларусі Міхаіл Савіцкі, Май Данцыг, Віктар Грамыка, Арлен Кашкурэвіч, Леанід Шчамялёў, Георгій Паплаўскі, Іван Міско, Васіль Шаранговіч. Сёння іх працы ўвайшлі ў залаты фонд нацыянальнага мастацтва. На выставе прадстаўлены больш за 50 творчых работ выпускнікоў каледжа. Яны ілюструюць сувязь часоў, пераемнасць традыцый і ўзнікненне навацый у беларускім выяўленчым мастацтве.

Выстава прадоўжыцца да 24 ліпеня.

✓**8 чэрвеня** ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага адбылося адкрыццё выставы жывапісу **«Фарбы Радзімы»** да 80-годдзя з дня нараджэння П.П. Шарыпы (1942 – 2013). У экспазіцыі прадстаўлены работы аднаго з майстроў беларускага жывапісу другой паловы ХХ ст. Яго творчасць вылучаецца цэльнасцю і непаўторнай каларыстыкай. Экспануецца больш за 70 работ аўтара ў розных жанрах: партрэт, тэматычная карціна, нацюрморт, пейзаж. У спадчыне майстра – вялікая колькасць эцюдаў, напісаных у розных кутках Беларусі. Гэта лясы і квітнеючыя лугі яго малой радзімы Аршаншчыны, азёры Браслаўшчыны, рэкі Міншчыны. З бездакорным густам уключаны ў пейзаж выдатныя помнікі старажытнай беларускай архітэктуры. Па натурных уражаннях быў напісаны шэраг гістарычных пейзажаў. У гэтых творах знайшла ўвасабленне шчырая любоў мастака да сваёй Радзімы, да яе багатай гісторыі і культуры.

Выстава працуе да 26 чэрвеня.

✓**9 чэрвеня** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылося ўрачыстае адкрыццё часовай экспазіцыі **«50 імгненняў: фоталетапіс жыцця народнага паэта Беларусі Якуба Коласа»**, прымеркаванай да юбілею песняра. На фотавыставе прадстаўлены 50 імгненняў з жыцця класіка беларускай літаратуры. 50 фотапартрэтаў беларускага песняра складаюць яго фоталетапіс – пачынаючы ад першага вядомага нам здымка, зробленага ў 1901 г. у Нясвіжы, і заканчваючы фотаздымкам 1956 г., апошняга года жыцця пісьменніка. Імгненні жыцця Якуба Коласа трапілі ў аб'ектыў розных вядомых фатографаў, сярод якіх варта адзначыць Генрыха Фрыда, Рыгора Вайля, Майсея Напельбаума, Зянона Паўлоўскага, Іллю Берліна, Яўгена Рапасава, Уладзіміра Кітаса, Міхаіла Савіна, Георгія Бугаенку, а таксама фотааматараў – беларускага пісьменніка, сябра Якуба Коласа Міхася Лынькова і малодшага сына песняра Міхася Міцкевіча. Якуб Колас быў і мудрым філосафам, якога хвалявалі адвечныя пытанні дабра і зла, праўды, волі, справядлівасці, сэнсу і мэты чалавечага жыцця. Філасофскія выказванні пісьменніка, многія з якіх сталі крылатымі, дапаўняюць фотаздымкі.




✓ **10 чэрвеня** ў галерэі Андрэя Вераб'ёва ў Магілёве адкрылася выстава мясцовага мастака Ігара Адамовіча **«Горад»**, прымеркаваная да 755-годдзя горада. Што ёсць горад? Найперш, гэта людзі. Іх жыццёвыя сцежкі, радасць і гора, расчараванні, адчай і надзея, нязгасная надзея ў светлае, добрае, вечнае. Горад – гэта рух наперад, імклівы і ў той жа час цыклічны. Палотны Ігара Адамовіча пра ўзаемасувязь месцаў, часоў і кожнага з нас у гэтым нястрымным ашаламляльным віры, названым жыццём. Выстава прысвечана Магілёву, яго мінуламу і сучаснаму.

Выстава працуе па 29 ліпеня.

✓ **10 чэрвеня** ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў адкрылася выстава **«Шагал. La Bible»**. На ёй прадстаўлены 64 літаграфіі Шагала, створаныя як ілюстрацыі да Старога Запавету. Спецыяльна для гэтай серыі твораў мастак і авалодаў тэхнікай літаграфіі. Майстар пачаў ствараць гэтыя творы ў 1930-я гады, а скончыў ужо пасля Другой сусветнай вайны. 24 работы з серыі «Вокны Іерусаліма» таксама ўключаныя ў экспазіцыю, з'яўляюцца эскізамі вітражоў для сінагогі пры шпіталі ў Іерусаліме. Працы суправаджаюцца біблейскімі тэкстамі, якія апісваюць кожны асобны сюжэт – гэта дазваляе глыбей зразумець адлюстраванне біблейскіх сюжэтаў у творчасці Марка Шагала.

Пабачыць літаграфіі можна да 28 жніўня.

*Скарыстаная інфармацыя Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага, Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, галерэі Андрэя Вераб'ёва, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ